росціш. Праз колькі выпрабаванняў яму давялося прайсці! Апошняе з іх — сацыяльна-эканамічны крызіс канца 1980 — 1990-х гадоў. Аднак ёсць спадзяванні, што, хаця і вельмі марудна, ён адыходзіць у мінулае.

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы 1998 г. слаўгарадчане выйшлі пераможцамі ў рэспубліканскім спаборніцтве па ўборцы зерневых і зернебабовых культур. За гэта раён атрымаў Ганаровы дыплом і грашовую прэмію ў памеры 150 млн. руб. і легкавы аўтамабіль для службовага карыстання. Ганаровым дыпломам і прэміяй у памеры 80 млн. руб. адзначаны і калгас «Зарэчанскі». А старшыня райвыканкома В.В.Берастаў і старшыня калгаса А.М.Самусёў асабіста адзначаны наручнымі гадзіннікамі.

Па гэтых гадзінніках будуць вымярацца крокі раёна наперад. Няхай жа шлях будзе добрым.

*П.С.Ерашэнка, В.А.Новікаў.*

## Подзвіг даўжынёй у два гады

Калі летам 1941 г. навісла пагроза акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі в. Дуброўка, Фядора Кузьмінічна Дудзянкова прыгнала калгасны статак кароў у глыбокі тыл. Там яна два гады даглядала і зберагала жывёлу, а пасля вызвалення Слаўгарадчыны ад гітлераўцаў вярнулася ў родную вёску разам з калгасным статкам. Гэта быў сапраўдны працоўны подзвіг — подзвіг даўжынёй у два гады.

## На будаўніцтва экскадрыллі самалётаў

1 красавіка 1944 г. у «Советской Белоруссии» і іншых газетах рэспублікі была змешчана вось такая інфармацыя:

«Журавичи, 30 марта (БЕЛТА). Колхозники района внесли на строительство экскадрильи самолетов 269 тыс. рублей. В ряде колхозов в фонд строительства самолетов вносятся зерно и другие продукты.

Колхозники сельхозартели «Первый ударный» внесли 166 центнеров зерна».

«Першым ударным» называўся калгас у маёй роднай вёсцы Бахань, якая потым увайшла ў склад Слаўгарадскага раёна. Гэта зерне не было лішнім у маіх землякоў. Але яны вырашылі: лепш будуць есці аладкі з мёрзлай бульбы, толькі няхай Чырвоная Армія хутчэй дабівае ненавіснага ворага.

*К.Е.Жукаў.*

## Франтавыя брыгады

6 красавіка 1944 г. у Слаўгарадзе адбыўся раённы партыйны сход. Яшчэ з фронту даносіліся гукі артылерыйскай кананады, яшчэ на палях валялася пакарабачаная баявая тэхніка, а камуністы раёна ўжо абмяркоўвалі пытанне падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы. Усяго ў сходзе ўдзельнічала 39 членаў і кандыдатаў у члены партыі, 13 з якіх выступілі ў спрэчках.

Да пачатку веснавых палявых работ у МТС меліся 24 трактары. У насенны фонд было засыпана па раёне 2121 ц збожжавых і 102,9 ц тэхнічных культур, што складала ўсяго 20% ад неабходнай колькасці. Яшчэ горш было з бульбай. Яе засыпана было ўсяго 2144 ц — 9,8% ад патрэбнага насеннага фонду.

Аднак, нягледзячы на такое становішча, гаспадаркі пачалі актыўна рыхтавацца да веснавой сяўбы. Так, у калгасе «Пралетарый», дзе старшынёй тады працаваў тав. Пусянкоў, быў поўнасцю адрамантаваны ўвесь сельскагаспадарчы інвентар, ачышчана насенне, створана 5 брыгад і 20 звенняў.

Да пачатку вясны 1944 г. у адноўленых калгасах раёна было створана 189 брыгад і 281 звяно, на рамонце сельскагаспадарчага інвентару працавала 15 кавалёў.

У сакавіку праведзены 10-дзённы семінар старшынь і брыгадзіраў калгасаў,

рахункаводаў. На 5-дзённым семінары вучыліся старшыні і сакратары сельскіх Саветаў.

У раёне працавала 26 агіткалектываў, якія аб'ядноўвалі 203 агітатары. Акрамя таго, у 42 гуртках вывучалася гісторыя ВКП(б). Асабліва ўзмацнілася агітацыйна-масавая работа ў перыяд веснавой сяўбы.

Усе 6 трактарных брыгад Слаўгарадскай МТС аб'явілі сябе франтавымі, заключылі паміж сабой дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва. Была ўстаноўлена дошка паказчыкаў, на якой штодзённа адзначаліся перадавікі вытворчасці. Агітатары кожны дзень знаёмілі трактарыстаў са зводкамі аб ходзе выканання прынятых абавязацельстваў у гонар Першамая.

Трактарныя брыгады МТС дамагліся добрых вынікаў. Ужо на 20 чэрвеня было выканана гадавое заданне — узарана 3000 га ворыва, пры гэтым зэканомлена 11 000 кг гаручага.

Пераможцам у спаборніцтве стала трактарная брыгада № 4, дзе брыгадзірам быў Мікалай Баранок. Пры плане 288 га яна ўзарала 560 га, а трактарыст брыгады Міхаіл Манчанка ўзараў 180 га замест планавых 96.

Брыгада № 2, якой кіраваў Афанасій Берасцень, узарала 500 га ворыва пры плане 288, зэканоміла 1600 кг гаручага. Трактарыстка брыгады Ніна Анцюк узарала 160 га ворыва пры плане 96.

На 10 снежня Слаўгарадская МТС выканала план на 219%, зэканоміла 17 800 кг гаручага. Выпрацоўка на адзін трактар магутнасцю 15 к.с. у сярэднім па МТС склала 276 га.

У сацыялістычным спаборніцтве камсамольска-маладзёжных брыгад удзельнічалі 3 брыгады МТС. Брыгадзе, якую ўзначальваў тав. Баранок, як пераможцы ў спаборніцтве была ўручана другая прэмія ЦК ЛКСМБ і Наркамата земляробства рэспублікі, а трактарыст Уладзімір Сергіенка ўзнагароджаны Ганаровай граматай ЦК ЛКСМБ і грашовай прэміяй.

Слаўгарадскай МТС па выніках работы за 1944 г. быў уручаны пераходны Чырвоны сцяг Магілёўскіх абкома КПБ і аблвыканкома з выдачай грашовай прэміі ў суме 10 000 рублёў.

На наступны 1945 г. калектыў Слаўгарадскай МТС узяў на сябе яшчэ больш высокія абавязацельствы і звярнуўся да ўсіх калектываў машынна-трактарных станцый рэспублікі ўключыцца ва «ўсебеларускае сацыялістычнае спаборніцтва за ўзорную падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы, за выкананне і перавыкананне плана трактарных работ у 1945 сельскагаспадарчым годзе, за хутчэйшае аднаўленне МТС і калгасаў і ператварэнне машынна-трактарных станцый ва ўзорныя, культурныя прадпрыемствы на вёсцы».

І гэты год стаў для іх двойчы пераможным. Калгасныя механізатары дасягнулі новых працоўных поспехаў, а франтавікі адзначылі яго перамогай над фашыстамі.

*І.І.Гаўрылаў.*

## Раёнка паведамляла...

### Па старонках газеты «Калгасны шлях» за 1946—1958 гг.

**8 сакавіка 1946 г.**

ЗАСЛУЖАНАЯ НАСТАЎНІЦА

37 год працуе настаўніцай у Слаўгарадскім раёне Ганна Феонаўна Лявонава. Аддаючы ўсе сілы і веды любімай рабоце, яна за гэты час выхавала многа патрыётаў — інжынераў, урачоў, лётчыкаў, танкістаў, пехацінцаў і самаадданых калгаснікаў і калгасніц.

Савецкі ўрад высока ацаніў працу Ганны Феонаўны. У 1939 г. тав. Лявонава ўзнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Адначасова ёй прысвоена званне заслужанай настаўніцы школы БССР.

**1 лістапада 1946 г.**

КАЛГАСНАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

Закончана будаўніцтва і пушчана ў эксплуатацыю электрастанцыя магутнасцю 35 кілават у сельгасарцелі «Чырвоны пуцілавец» Лапаціцкага сельсавета. Электрычны свет атрымаюць 75 дамоў калгаснікаў.

**25 лістапада 1946 г.**

З кожным годам павялічваецца сетка школ. У раёне працуе 52 пачатковыя, 12

НСШ і 1 СШ з ахопам 2542 дзяцей. Апрача таго, працуюць 3 вячэрнія школы дарослых, дзіцячы дом, сад, яслі, 13 хат-чытален, раённы дом культуры.

**22 чэрвеня 1947 г.**

Уключыўшыся ў месячнік па будаўніцтву дамоў для насельніцтва, пражываючага ў зямлянках, працоўныя раёна прарабілі значную работу. За 20 дзён чэрвеня пабудавана 26 новых дамоў, зроблена 88 зрубаў, апрача таго, вывезена лесаматэрыялу на будаўнічыя пляцоўкі ў колькасці 1510 кубаметраў і нарыхтавана 1240 кубаметраў.

На будаўніцтве дамоў заняты 354 чалавекі, створаны і працуюць 59 будаўнічых брыгад.

**21 сакавіка 1948 г.**

Асенне-зімовы план нарыхтовак і вывазкі лесу члены сельгасарцелі імя Варашылава Гайшынскага сельсавета выканалі з гонарам. На прыстань вывезена 260 кубаметраў, што на 46 кубаметраў больш планавага задання.

Уся цяглавая сіла зараз пераключана на завяршэнне падрыхтоўкі да палявых работ.

**8 красавіка 1948 г.**

## УРУЧЭННЕ ГАНАРОВЫХ ГРАМАТ

1 красавіка адбыўся сход рабочых, служачых і спецыялістаў гаспадаркі Слаўгарадскай МТС, прысвечаны ўручэнню Ганаровай граматы ЦК ВЛКСМ маладому трактарысту Васілю Маргунову.

У той жа дзень Ганаровая грамата ЦК ЛКСМБ была ўручана звеннявой калгаса «Свабода» Ржаўскага сельсавета Вользе Стральцовай, якая дасягнула ў 1947 годзе высокага ураджаю.

**26 мая 1949 г.**

## НАРАДЗІЛАСЯ ТРОЙНЯ

Калгасніца сельгасарцелі «8 Сакавіка» Іванішчавіцкага сельскага Савета Мацвеенка Марыя Ларыёнаўна нарадзіла тройню — дзвюх дзевачак і аднаго хлопчыка. Маці і нованароджаныя знаходзяцца ў добрым становішчы. За імі ўстаноўлен спецыяльны догляд урачоў.

**31 ліпеня 1949 г.**

## ЛЕПШЫЯ ЖНЕІ КАЛГАСА

У калгасе «Камунар» Кульшыцкага сельсавета лепшымі жнеямі па праву лічацца Барсукова Хадора, Малахава Вера, Шаўцова Варвара і Цыганкова Агаф'я. З ранку да позняга вечара яны працуюць на жніве і, спаборнічаючы паміж сабой, павышаюць норму выпрацоўкі. Барсукова Хадора сжала ўжо 2,69 га і давяла сваю дзённую выпрацоўку да 0,44 га.

**26 жніўня 1951 г.**

## ДВА ПЛАНАВЫЯ ЗАДАННІ

Каўчукаводчае звяно № 5 калгаса імя Будзённага Рагінскага сельсавета сабрала 49,3 кг насення кок-сагызу пры плане 20,4 кг. Звеннявая Благадзерава М. асабіста сабрала 8,5 кг насення, а калгасніца Цвярдова М. — 6,5 кг.

**9 сакавіка 1952 г.**

Жанчына-маці акружана ў Савецкай краіне пашанай і павагай. У раёне 9 мацярэй удастоены ганаровага звання «Маці-гераіня», 986 мацярэй узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Дзяржавай выплачана мнагадзетным і адзінокім мацярам раёна толькі за 1951 год 1.095.800 рублей дапамогі.

**29 лістапада 1953 г.**

## ХЛЕБАПЯКАРНЯ Ў ВЁСЦЫ

У вёсцы Лапацічы Лапаціцкага сельсавета ўступіла ў дзеянне хлебапякарня, у якой штодзённа зараз выпякаецца больш 500 кг хлеба і хлебабулачных вырабаў.

Гэта дасць магчымасць забяспечыць хлебам механізатараў Жалезінскай МТС і насельніцтва Лапаціцкага сельсавета.

**15 красавіка 1954 г.**

## ПАЧАЛАСЯ НАВІГАЦЫЯ

На рацэ Сож пачалася навігацыя. Прыбыццём у Слаўгарад парахода «Пралетарый», які прывёз першых пасажыраў і грузы, адкрыўся рэгулярны пасажырскі рух Слаўгарад—Гомель.

У гэтым годзе значна зніжаны цэны за правоз сельскагаспадарчых грузаў.

Сёлета паміж урочышчам «Старык» і вёскай Крэмянка нашага раёна будзе дадаткова курсіраваць пасажырскі кацер.

**9 верасня 1954 г.**

## МУЗЫЧНАЯ ШКОЛА

З 1 верасня ў райцэнтры адкрыта і працуе музычная школа. Яе наведвае 15 навучэнцаў.

З музычных інструментаў для школы закуплена піяніна.

**1 студзеня 1955 г.**

У 1955 годзе працягваліся работы па радыёфікацыі калгасных вёсак. У строй уступілі магутныя радыёвузлы калгасаў «Звязда», «Пралетарый» і імя Малянкова. У такіх калгасах, як імя Сталіна, імя Крупскай, імя Малянкова, «Пралетарый» радыёфікавана па 200—250 дамоў калгаснікаў.

**30 верасня 1955 г.**

Раённы аддзел культуры падвёў вынікі спаборніцтва кінамеханікаў за верасень месяц. Першынство ў спаборніцтве заваяваў кінамеханік Іван Масарэнка, які абслугоўвае Целяшоўскі і Гіжэнскі сельсаветы. Ён выканаў план па ўсіх паказчыках на 118 працэнтаў.

**16 снежня 1956 г.**

У сельгасарцелі імя Крупскай здан у эксплуатацыю новы млын. Млын працуе ад электраматора.

З уводам у дзеянне ўласнага млына значна аблегчылася справа забеспячэння мукой грамадскай жывёлагадоўлі.

**27 студзеня 1957 г.**

Целяшоўская сярэдняя школа трымае цесную сувязь з калгаснай вытворчасцю. Сіламі вучняў старэйшых класаў за апошнія дні ў калгасе імя Сталіна ачышчана ад кустарнікаў 5 гектараў лугу.

**20 чэрвеня 1957 г.**

Аблвыканком падвёў вынікі спаборніцтва гарадоў вобласці па добраўпарадкаванню. У ліку лепшых адзначан таксама Слаўгарад. Гэта абавязвае жыхароў райцэнтра прыкласці больш намаганняў, каб зрабіць родны горад яшчэ прыгажэйшым.

**26 снежня 1957 г.**

Гіжэнскі калгасны клуб папоўніўся новымі музычнымі інструментамі, мэбляй, набыў настольны тэніс. Зараз сюды ахвотна збіраецца калгасная моладзь, каб весела і культурна правесці свой вольны ад работы час.

**1 студзеня 1958 г.**

У снежні 1957 г. калектыў Нікалаеўскага суднабудаўнічага завода імя Носечка закончыў будаўніцтва судна, якому было прысвоена імя «Слаўгарад». 1 студзеня 1958 г. цеплаход «Слаўгарад» уступіў у склад дзеючага гандлёвага флота Саюза ССР.

**11 лістапада 1958 г.**

РЭДКАЯ ЗНАХОДКА

Нядаўна вучні 5 класа Гайшынскай школы у кар'еры вапнавага завода знайшлі ракавіну выкапнёвага малюска і зуб мамана.

Гэтыя рэдкія знаходкі папоўняць краязнаўчы куток, які ствараецца пры школе.

## Рэха вайны

Здарылася гэта ў 1948 г. Стаяла цёплая чэрвеньская раніца. Сонца толькі што пусціла першыя промні. Разам з імі з в. Ляцягі ў напрамку в. Улукі ішоў Іван Сазонаў. Штосьці шчымела ў сэрцы, ногі не хацелі рабіць крокі. На душы была трывога. Ён ішоў у задуменні і ўспамінаў пра свайго бацьку Восіпа Іванавіча, які загінуў на вайне. Думаў ён і пра свой «ХТЗ». Трактар гэты быў са стальнымі шыпамі на задніх колах. Заводзіўся не стартэрам, а толькі ручкай. Круціць тую ручку сіла трэба была немалая. Кабіны ніякай не было. Дождж, снег, вецер не лічыліся перашкодай для работы. І вось Сазонаў падышоў да трактара. Прыняў яго ад напарніка, што працаваў у начную змену. Заліў у бак гаручае. Тут жа быў і прычэпшчык Цімашкоў Аляксандр Аляксандравіч, які на паваротах апускаў і падымаў плугі. Адразу прыступілі да працы. Праз некалькі гадзін зрабілі перапынак. Перакусілі прынесенай з сабой лустай, і зноў загудзеў матор. І раптам — выбух. Усё ўзляцела ў паветра. Пыл, дым, полымя змяшаліся ў адзінае цэлае. Цімашкоў быў смяротна паранены, а Сазонава крокаў на 30—50 адкінула ў бок на толькі што ўзаранае поле. Трактар разарвала на кавалкі. Часткі ад яго былі раскіданы навакол. Праз некаторы час з'явіліся людзі. Прычэпшчык быў ужо


І.В.Сазонаў.


А.Р.Маргуноў.

мёртвы. А Сазонава знайшлі непрытомным і адправілі ў бальніцу, дзе ён праляжаў доўга. Яго ногі, рукі і ўсё цела павольна прыходзілі да нормы.

Пасля выздараўлення ён ужо не працаваў трактарыстам, а выконваў пасільную работу. Зараз Сазонаў на пенсіі. І калі ўспамінае аб тым трагічным здарэнні, то заўсёды здзіўляецца, як гэта ён застаўся жывы ад такога страшэннага выбуху.

*У.К.Цішчанка.*

## Цяжка было, але ніхто не скардзіўся

**З успамінаў А.Р.Маргунова, былога старшыні калгаса «XVI партз'езд»**

Вестку аб вызваленні Слаўгарада я пачуў у шпітальнай палаце. Праз некаторы час ужо пешшу дабіраўся да сваёй роднай Ржаўкі. Сустрэўся з сям'ёй, знаёмымі, а затым накіраваўся ў райцэнтр. Іду з пасведчаннем аб дэмабілізацыі і прызначэнні пенсіі ў кішэні і думаю: «Інвалід, без рукі, на што ты варты цяпер?». А ў райкоме партыі мне прапанавалі ўзначаліць калгас «XVI партз'езд». Спачатку разгубіўся, але, падумаўшы, даў згоду.

З чаго прыйшлося пачынаць?

Шэсць коней, два рабочыя быкі — вось і ўсё, як кажуць, жывое цягло. Дзевяць кароў, дзве свінаматкі — гэта прадукцыйны калгасны статак. Ні кармоў, ні памяшканняў, ні грошай. Зараз нават цяжка ўявіць, як мы тады канцы з канцамі зводзілі. Набліжалася першая пасяўная пасля вызвалення. Не было насення бульбы. І людзі, уразаючы і без таго свае мізэрныя запасы, сабралі па пуду — два бульбы. Выдзеліла нам насенне яравых збожжавых дзяржава. Але яно ляжала ў Слаўгарадзе. Вырашылі прынесці яго на сабе. Раніцай у райцэнтр пайшла група калгаснікаў: Захар Марухаў, Уладзімір Маслоўскі, Фама Краўцоў і іншыя. Увечары яны вярнуліся ў Ржаўку, і кожны з іх прынёс па 20 — 30 кг насення, і так было не адзін раз. Пешшу, за 18 кіламетраў, насілі людзі на сабе насенне. А калгаснікам паўночных вёсак раёна прыходзілася насіць зерне аж з чыгуначнай станцыі Чавусы, што было яшчэ далей, чым нам. Ішла вайна, і кожны тады працаваў за дваіх, за траіх.

Сабралі першы ўраджай. І адразу ж з калгаса ў Слаўгарад накіраваўся абоз са збожжам. 80 т хлеба засыпаў тады наш калгас у засекі дзяржавы. Толькі насенне пакінулі сабе, ды рэшту раздалі хлебаробам на працадні.

Акрамя таго, трэба было ўзводзіць жывёлагадоўчыя памяшканні, будаваць дамы, нарыхтоўваць кармы. Людзі і сеялі, і жалі, касілі і малацілі, нарыхтоўвалі лесаматэрыял, нават на сабе цягалі плуг, садзілі бульбу. Цяжка было, але ніхто не скардзіўся.

А ў наступным годзе калгас яшчэ больш упэўнена набіраў сілы. Тады мы завезлі на дзяржаўны прыёмны пункт 145 т збожжа, займелі ўласнае насенне ўсіх культур, выдалі хлеб і бульбу на працадні калгаснікам.

## Чарнобыльская хмара над Слаўгарадчынай

26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, што размешчана на тэрыторыі Украіны непадалёку ад граніцы з Беларуссю, адбылася адна з буйнейшых аварый у свеце. У выніку двух выбухаў на чацвёртым энергаблоку ЧАЭС у атмасферу трапіла велізарная колькасць радыеактыўных рэчываў. Каля 70% радыенуклідаў, выкінутых на тэрыторыі еўрапейскай часткі СССР, выпала на тэрыторыі Беларусі.

Чарнобыльская хмара дасягнула і